Даты | Падзеі | Людзі

## 19 КРАСАВІКА

### У краіне

**1563** год — Пётр Мсціславец, беларускі першадрукар і гравёр, у Маскоўскай друкарні Івана Фёдарава пачаў друкаваць першую дакладна датаваную кнігу «Апостал» (на царкоўнаславянскай мове ў рускай рэдакцыі, захаваўся 61 экзэмпляр).



**1810** год — нарадзіўся Іван Пятровіч Барычэўскі, гісторык, археолаг, фальклярыст, этнограф, перакладчык. У 1829 годзе скончыў Мінскую духоўную семінарыю, затым Кіеўскую духоўную акадэмію. Служыў у розных дэпартаментах, у Галоўным упраўленні шляхоў зносін. Удзельнічаў у збіранні матэрыялаў і падрыхтоўцы выданняў Археаграфічнай камісіі. Аўтар кнігі «Праваслаўе і руская народнасць у Літве», артыкулаў у часопісах «Пра рускі летапіс у Літве, названы «Хроніка Быхаўца», «Камяні літоўскіх багінь», «Даследаванне пра паходжанне, назву і мову літоўскага народа» і іншых. Запісы фальклору паўднёвых і заходніх славян апублікаваны ў яго кнізе «Аповесці і паданні народаў славянскага племя» і ў нарысе «Народныя славянскія аповеды». Памёр у 1887 годзе.

**1912** год — нарадзіўся (г. Полацк) Леанід Прокша, беларускі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў і нарысаў «Крыніца прыгажосці», памфлетаў «Камедыянты», «След вядзе за мяжу», «Інтрыгі прэзідэнцкага двара», рамана «Пакуль жывеш на свеце», твораў для дзяцей. Памёр у 1994 годзе.

**1948** год — нарадзіўся (г. Чэрвень) Міхаіл Міхайлавіч Пікулік, беларускі вучоны ў галіне герпеталогіі, экалогіі жывёл, аховы і выкарыстання жывёльнага свету, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле праведзены даследаванні па ацэнцы дынамікі фауны і стану зоацэнозаў у натуральных і антрапагенных ландшафтах Беларусі, а таксама наступстваў аварыі на ЧАЭС у фарміраванні біялагічнай разнастайнасці дзікай фауны. Аўтар больш як 230 навуковых прац. Памёр у 2006 годзе.

### У свеце

**1810** год — пачалася Вайна за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы 1810—1826 гадоў.

**1902** год — нарадзіўся Веніямін Каверын, рускі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў, раманаў «Бубновая масць», «Два капітаны», «Адкрытая кніга» і іншых.

**1943** год — пачалося ўзброенае паўстанне вязняў Варшаўскага гета супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў — першае гарадское паўстанне ў акупіраванай немцамі Еўропе і першы масавы пратэст яўрэйскага насельніцтва супраць фашызму.